УДК 94(476)"1939/1941"

# ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІМ РЭГІЁНЕ (ВЕРАСЕНЬ 1939 – ЧЭРВЕНЬ 1941 гг.)

**Г. С. Хадасевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, annahadasevich@gmail.com*

Пераўтварэнні, якія адбываліся на заходнебеларускіх землях у верасні 1939 – чэрвені 1941 гг. закранулі ўсе сферы жыцця грамадства. У артыкуле аналізуюцца пераўтварэнні ў сферы эканомікі. Зроблены акцэнт на перавод ўсіх галін прамысловасці заходнебеларускага рэгіёну на савецкія формы гаспадарання. Праведзеныя рэформы карэнным чынам змянілі эканоміку Заходняй Беларусі, стварылі ўмовы для развіцця прамысловасці ў новых рэаліях.

***Ключавыя словы:*** Заходняя Беларусь; Народны сход; БССР; заходнебеларускі рэгіён; пераўтварэнні; прамысловасць; эканоміка.

# ЭКОНОМИЧЕСКИЕ ПРЕОБРАЗОВАНИЯ В ЗАПАДНО-БЕЛОРУССКОМ РЕГИОНЕ (СЕНТЯБРЬ 1939 – ИЮНЬ 1941 гг.)

**А. С. Хадасевич**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, annahadasevich@gmail.com*

Преобразования, которые происходили на западно-белорусских землях в сентябре – июне 1941 гг., затронули все сферы жизни общества. В статье анализируются преобразования в сфере экономики.Сделан акцент на перевод всех отраслей промышленности западно-белорусского региона на советские формы хозяйствования. Проведенные реформы коренным образом изменили экономику Западной Беларуси, создали условия для развития промышленности в новых реалиях.

***Ключевые слова:*** Западная Беларусь; Народное собрание; БССР; западно-белорусский регион; преобразования; промышленность; экономика.

# ECONOMIC TRANSFORMATION IN THE WESTERN REGION OF THE BELARUS (IN SEPTEMBER 1939 – JUNE 1941)

**H. S. Khadasevich**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, annahadasevich@gmail.com*

The transformation that took place on the western Belarusian lands in September 1939 – June 1941 affected all the spheres of society. In the article analyzes transformation in the economic sphere. Emphasis was placed on the transfer of all sectors of the economy of the

Western Belarusian region to Soviet forms of management. The reforms carried out radically changed the economy of Western Belarus created conditions for industrial development in new realities.

***Keywords:*** Western Belarus; Peoples Assembly; BSSR; western Belarusian region; reorganization; industry; economic.

Тэрытарыяльнае далучэнне заходнебеларускіх зямель да БССР у верасні 1939 г. стала вызначальнай падзеяй у гісторыі станаўлення беларускай нацыі, што дазволіла беларускаму народу аб'яднацца ў межах адной дзяржавы і аднавіць, у поўнай меры, гістарычную справядлівасць. Аднак далучэнне Заходняй Беларусі да СССР у якасці тэрытарыяльнай адзінкі яшчэ не вызначыла «зліццё» з савецкай сістэмай грамадскіх адносін у палітычным, эканамічным і сацыяльна-культурным вымярэннях. Для дасягнення гэтай мэты новаўтвораным заходнім вобласцям БССР належала прайсці доўгі шлях, на якім былі сур'ёзныя перашкоды і які патрабаваў значнага прамежку часу. Паскарэнне тэмпаў саветызацыі ў далучаных землях прывяло да значных пераўтварэнняў ва ўсіх сферах жыцця ў рэгіёне, якія мелі як станоўчыя так і адмоўныя рысы. Адным з такіх напрамкаў былі эканамічныя пераўтварэнні. Восенню 1939 г. у прамысловым сектары эканомікі Заходняй Беларусі пачалі адбывацца значныя пераўтварэнні, якія мелі вызначальнае значэнне для гэтага рэгіёну. Савецкае кіраўніцтва праводзіла паступовы перавод эканомікі на новыя, сацыялістычныя прынцыпы гаспадарання. Дадзены складаны працэс закрануў найперш буйныя гарады, дзе праходзіла актыўная фаза нацыяналізацыі прамысловых прадпрыемстваў і банкаў. Мясцовыя ўлады кіраваліся на пачатковым этапе дэкларацыяй Народнага сходу «Аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці», якая абвяшчала, што «прамысловыя прадпрыемствы належаць нацыяналізацыі з усімі пабудовамі, а таксама грашовымі сродкамі і іншай маёмасцю…» [2, арк. 71–72]. Аднак, акрамя буйных і сярэдніх прадпрыемстваў, была нацыяналізавана і большая частка дробных, што ў сваю чаргу супярэчыла папярэднім рашэнням Народнага сходу.

У дакладной запісцы на імя сакратара ЦК УКП(б) А. А. Жданава ад 15 кастрычніка 1939 г., П. Панамарэнка акцэнтаваў увагу партыйнага апарату на неабходнасці нацыяналізаваць у Заходняй Беларусі прадпрыемствы дрэваапрацоўчай, гарбарнай і тэкстыльнай прамысловасці, прычым апошнія павінны былі мець вялікую механічную сілу і не менш за 40 чалавек рабочых. Апроч таго, меркавалася правесці нацыяналізацыю тут усіх без выключэння камунальных электрастанцый, друкарняў і картаграфічных фабрык гарадоў, незалежна ад іх магутнасці і колькасці рабочых. Адносна лесапільных прадпрыемстваў адзначалася, што толькі буйныя

маглі і далей функцыянаваць за дзяржаўны кошт, а больш дробныя патрабавалася зачыніць, бо яны бескантрольна вынішчалі лясныя масівы краю. Кіраванне прадпрыемствамі здзяйснялі як спецыяльныя наркаматы, створаныя для розных галін вытворчасці, так і ў асобных выпадках трэсты, якія мелі сваю структуру падпарадкавання [10, с. 35–36].

Але не адразу нацыяналізацыя ўступіла ў поўную моц, не ўсе сферы вытворчасці яна закранула ў першыя месяцы пасля верасня 1939 г. Напачатку дзейнасці савецкай улады, на пасяджэннях часовых упраўленняў, усё часцей пачалі гучаць скаргі аб невыкананні тэрміновых мер, якія лічыліся ключавымі ў справе развіцця і замацавання строгай сістэмы кантролю і дысцыпліны на мясцовых прадпрыемствах. Так, напрыклад, на адным з пасяджэнняў часовага ўпраўлення г. Кобрына ў лістападзе 1939 г. абмяркоўвалася пытанне аб паскарэнні нацыяналізацыі буйных фабрык горада, а таксама вялася гаворка пра неабходнасць распрацоўкі канкрэтнага складу асоб для працы на прадпрыемствах і аб стварэнні сярод рабочых прафсаюзных ячэек [8, с. 212].

Напрыканцы 1939 г. пачаўся працэс адраджэння і ўзбуйнення прамысловых прадпрымстваў, якія на той момант існавалі ў заходніх абласцях БССР. Паралельна з гэтым адбывалася маштабнае будаўніцтва новых фабрык і заводаў, тэхнічнае абсталяванне для якіх завозілася з Расіі, Украіны і ўсходніх рэгіёнаў Беларусі. Напрыклад, былі ў кароткі тэрмін рэканструяваны Лідскі завод сельскагаспадарчых машын, Гродзенскі роварны завод, тэкстыльныя фабрыкі г. Беластока. Узбуйненне асобных прадпрыемстваў праходзіла праз аб'яднанне некалькіх дробных.

Перабудова заходнебеларускай эканомікі на савецкі лад з самага пачатку адбывалася згодна з комплексам мерапрыемстваў, зацверджаным і распрацаваным у трэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1938–1942 гг. У гэтым плане былі запісаны тэрміны будаўніцтва новых буйных прамысловых прадпрыемстваў, выпрацаваны схемы пастаўкі тэхнічнага абсталявання — ўсё тое, што, на думку спецыялістаў, павінна было ўзмацніць эканамічны патэнцыял рэспублікі.

Сацыялістычная сістэма гаспадарання змяняла аблічча заходнебеларускіх прадпрыемстваў. Значна павялічылася колькасць рабочых у лёгкай прамысловасці. Узбуйненне ж садзейнічала паляпшэнню арганізацыйнай структуры на прадпрыемствах, павелічэнню ўзроўню працоўнай дысцыпліны і выпуску адпаведнай прадукцыі. На гэтыя мэты дзяржава асігнавала значныя сумы, а агульны бюджэт заходніх рэгіёнаў БССР складаў у 1940 г. прыкладна 730 млн рублёў. Аднак, нягледзячы на станоўчы рух індустрыялізацыі, умовы жыцця мясцовага насельніцтва заходніх абласцей БССР ў гарадах заставаліся даволі цяжкімі. Папершае, не хапала жылля, таму

многія сем'і гараджан былі вымушаны жыць у паўразбураных памяшканнях і падвалах. Падругое, істотных матэрыяльных і грашовых сродкаў патрабавала аднаўленне тых гарадоў Заходняй Беларусі, якія значна пацярпелі ад нямецкіх паветраных бамбардзіровак у часы фашысцкага нашэсця на Польшчу. Асабліва вялікія страты панеслі Брэст, Граева, Семяцічы і інш. гарады. Паводле падлікаў беларускіх гісторыкаў, на хаця б частковае аднаўленне пашкоджаных будынкаў вышэйпералічаных гарадоў патрабавалася сума ў 8 млн руб., што ў сваю чаргу тлумачыла дастаткова павольны тэмп адбудовы.

Адной з найбольш вострых грамадскіх праблем, якую давялося вырашаць беларускаму савецкаму кіраўніцтву ў заходніх абласцях, была праблема беспрацоўя, якая ўзнікла яшчэ за польскім часам. Так, паводле падлікаў польскага Міністэрства сацыяльнай апекі, у 1938 г. у Заходняй Беларусі налічвалася прыблізна 20 тыс. беспрацоўных. Аднак на самой справе сітуацыя была яшчэ больш складаная, паколькі польская статыстыка не ўлічвала тых, хто працаваў няпоўны працоўны дзень або толькі некалькі дзён на тыдзень. Калі прымаць да ўвагі і дадзеныя паказчыкі, то ў рэальнасці агульная колькасць беспрацоўных была ў два разы большая і складала каля 40 тыс. чалавек [6, с. 459].

Партыйнае кіраўніцтва Беларускай ССР прымала самыя розныя захады, каб вырашыць праблему беспрацоўя. На працягу 1940 – першай паловы 1941 гг. у заходніх абласцях БССР актыўна будаваліся ваенныя і абарончыя аб'екты, праводзіўся рэмонт старых і пракладванне новых аўтамабільных дарог, значных працоўных рэзерваў патрабавалі лесанарыхтоўка і лесасплаў, практыкавалася накіраванне рабочых на заводы і фабрыкі ва ўсходнія вобласці рэспублікі. Дзякуючы ўсім гэтым мерапрыемствам беспрацоўе на заходнебеларускіх землях да пачатку 1941 г. было практычна ліквідавана.

Актуальным было і пытанне выплаты заробкаў рабочым прадпрыемстваў. Так, напрыклад, у Сталбцоўскім павеце да ліку буйных прадпрыемстваў быў залічаны Нова-Свержаньскі лесазавод, у якім у пачатку 1940 г. працавала 215 чалавек, а пасля яго ўзбуйнення і рэканструкцыі планавалася павялічыць колькасць рабочых да 500 чалавек. Таксама стратэгічным тут лічылася чыгуначнае дэпо горада, дзе налічвалася каля 170 рабочых. На гэтых прадпрыемствах, як адзначаў сакратар Стаўбцоўскага райкама КП(б)Б Столін, увогуле на той час адсутнічала строгая сістэма аплаты працы, што выклікала ў рабочых антысавецкія настроі. На Нова-Свержаньскім лесазаводзе падзённая аплата працы складала ўсяго 4 р. 13 к. за адзін працоўны дзень, у той час як 1 рабочы плаціў за абед у фабрычнай сталовай 4 руб. 50 к. У гарадскім дэпо слесар атрымоўваў не больш за 100 руб. у месяц. І такія выпадкі прасочвалі амаль у кожным раёне Заходняй Беларусі [3, арк. 43].

Не выконвалі ў поўнай меры планы вытворчасці і трэсты. Асабліва цяжкіх страт і няўдач зазнаў, напрыклад, Беластоцкі дзяржаўны рыбтрэст. Як паведамляў сакратар Беластоцкага абкама КП(б)Б Спасаў, у карыстанні гэтага рыбтрэста ў пачатку 1940 г. знаходзілася 1450 га азёраў і прудоў і налічвалася каля 18 рыбных гаспадарак, сярод якіх па вобласці мелася 10 гаспадарак з плошчай вадаёмаў 11 237 га і 1226 км рэк. Згодна з планам па дадзеным трэсце на 1940 г. меркавалася вырабіць таварнай прадукцыі 8000 цэнт., а пасадачнага матэрыялу 1140 цэнт. У выніку план быў выкананы толькі часткова. Нягледзячы на тое, што з дня пачатку работы рыбтрэсту прайшло дастаткова часу, яго кіраўніцтва не здолела арганізаваць вытворчасць рыбнай прадукцыі. Такое становішча прывяло да таго, што рыбныя гаспадаркі не былі падрыхтаваны належным чынам да вясенняй паводкі. Цяжкае матэрыяльнатэхнічнае становішча гэтага рыбтрэсту з’явілася таксама следствам адсутнасці дапамогі як кадравай, так і фінансавай з боку Галоўрыбпрама БССР [3, арк. 352].

Перабоі адбываліся і ў рабоце гарбарных фабрык заходнебеларускага рэгіёну. Як, напрыклад, паведамляў у сваёй дакладной запісцы на імя П. Панамарэнкі сакратар Беластоцкага абкама ЦК КП(б)Б С. С. Ігаеў ад 2 сакавіка 1940 г., асабліва складаная сітуацыя ў гэтай галіне вытворчасці была ў Беластоцкай вобласці. Галоўнай прычынай крызісу тут сталі нерэгулярныя пастаўкі сыравіны, што паралізавала работу прадпрыемстваў. У выніку незабеспечання асноўнымі матэрыяламі для вытворчасці (хромпік біхрамат калія, экстракт) гарбарныя фабрыкі выканалі план у студзені 1940 г. на 33,5 %, а за 20 дзён лютага — на 20 %. З 13 гарбарных прадпрыемстваў вобласці на 1 сакавіка былі закрыты 11, з якіх завод № 1 у г. Беластоку не працаваў нават з 1 студзеня, а завод № 5 у г. Гродна — з 1 лютага гэтага ж года. Астатнія 2 гарбарных завода працавалі з вялікімі перабоямі [3, арк. 263–264].

Асаблівую ўвагу савецкая ўлада надавала развіццю ў Заходняй Беларусі лясной прамысловасці, лесанарыхтовак і лесавывазак. Дадзеныя галіны вытворчасці былі выключна важнымі, бо іх прадукцыяй забяспечваліся школы, дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы, якія выпускалі высокаякасную мэблю. Гэтая прадукцыя набывала таксама значэнне для рэгіёну, калі ўлічыць, што яна фарміравала ў некаторай ступені і цэнавую палітыку ў краі. Як паведамляў, напрыклад, загадчык лясным аддзелам пры ЦК КП(б)Б Пыж, за перыяд з 23 студзеня па 25 лютага 1941 г. у Баранавіцкай вобласці было нарыхтавана 76,1 % лесу, а вывезена 58,1 % адпаведна, у Беластоцкай — 75,1 і 62,3, у Брэсцкай — 67,9 і 55,3, у Вілейскай — 91,6 і 80,9, у Пінскай — 53,1 і 46,5, у Палескай — 64,3 і 67,2, а ўсяго ў рэспубліцы было нарыхтавана 67,2 % і вывезена 59,4 %. З гэтай вялікай колькасці для школ вылучалася 43 $м^3$ лесу [1, арк. 110].

Павелічэнне аб'ёму лесанарыхтовак паскорыла выпуск драўлянай мэблі і іншага абсталявання, у тым ліку паперы. Таму зразумела, што паліграфічная прамысловасць Заходняй Беларусі перайшла на якасна новы ўзровень у сваім развіцці. Большасць мясцовых паліграфпрадпрыемстваў, што былі тут створаны да 1939 г. і знаходзіліся ў такіх гарадах, як Беласток, Навагрудак, Брэст, Маладзечна, Пінск, Гродна і Баранавічы, з прыходам савецкай улады былі нацыяналізаваны і рэканструяваны. Тэхнічнае абсталяванне некалькіх друкарняў Вільні, перад далучэннем гэтага краю да Літвы, было адтуль вывезена і перададзена ў карыстанне рэдакцыям павятовых газет і часопісаў і аддзелаў Наркамата мясцовай прамысловасці БССР [4, арк. 1–3].

Згодна з пастановай Бюро ЦК КП(б)Б «Аб мерапрыемствах па арганізацыі паліграфічнай прамысловасці Заходняй Беларусі», падпісанай намеснікам старшыні СНК БССР У. Г. Ванеевым, у вышэйпазначаных гарадах павінны былі пачаць работу буйныя друкарні, якія б забяспечвалі выпуск у абласных цэнтрах штотыднёвых газет і абслугоўвалі б друкарскай прадукцыяй усе дзяржаўныя ўстановы Заходняй Беларусі. З Масквы і з Мінску меркавалася завесці сюды 50 камплектаў газетных шрыфтоў на беларускай і рускай мовах, каля 5 лінатыпаў (пераважна з цэхаў друкарні газеты «Звязда»), 15 камплектаў матрыц к лінатыпам і інш. Непасрэдны кантроль за дзейнасцю гэтых друкарняў ажыццяўляў Белпаліграфтрэст.

Разам з тым, на пачатковым этапе ў дзейнасці паліграфічных прадпрыемстваў Заходняй Беларусі прасочваліся недахопы. У гарадскіх друкарнях не хапала спецыялістаў, а рабочыя працавалі за старым абсталяваннем. На некаторых фабрыках увогуле адсутнічалі рэдакцыйныя друкарскія машыны, было мала лінатыпаў (напрыклад, у Беластоку — 2 лінатыпы, у Брэсце — 1, у Гродна — 1), а самі друкарні знаходзіліся ў маленькіх памяшканнях. Замест беларускіх ці рускіх шрыфтоў, якіх заўсёды не хапала, друкары выкарыстоўвалі польскія [4, арк. 112].

Складана адбываўся працэс нацыяналізацыі прадпрыемстваў тэкстыльнай прамысловасці Заходняй Беларусі. Як адзначаў у дакладной запісцы наркам тэкстыльнай прамысловасці БССР Аляксееў, з агульнай колькасці 1803 станкоў, што меліся ў канцы 1939 г. на мясцовых шарсцяных фабрыках, толькі 703 станка з'яўляліся непасрэднай уласнасцю прадпрыемстваў. 1003 станка лічыліся ўласнасцю асоб, якія не мелі сваіх фабрык. Усе гэтыя асобы належалі да так званага саюзу «ланкетнікаў». Акрамя таго, каля 97 станкоў належыць фабрыкантам, якія мелі свае капіталы на чужых прадпрыемствах. Было падлічана, што толькі 32 % станкоў належыць асобам, якія не карыстаюцца наёмнай працай [4, арк. 115–116].

Каб не страціць падтрымку працоўных і ўзмацніць кантроль за дзейнасцю заходнебеларускага рабочага руху, савецкая ўлада пайшла на стварэнне шырокай сеткі прафсаюзных арганізацый, якія існавалі пераважна на базе прадпрыемстваў. Так, у лістападзе–снежні 1939 г. на заводах і фабрыках заходніх абласцей БССР былі праведзены выбары мясцовых і цэхавых прафсаюзных камітэтаў, а таксама прафсаюзных лідараў. Потым адбыліся выбары раённых, гарадскіх, абласных і дарожных камітэтаў прафсаюзаў. Як паведамляў сакратар Беластоцкага абкама КП(б)Б С. С. Ігаеў, 28 снежня 1939 г. адбылася па выніках выбараў Міжсаюзная канферэнцыя прафсаюзаў вобласці, якая вызначыла задачы далейшай работы абласных прафсаюзаў і абрала сваіх дэлегатаў на X Усесаюзны з'езд прафсаюзаў СССР. Прафсаюзы карысталіся падтрымкай і прыхільнасцю з боку рабочых прадпрыемстваў: напрыклад, на тэкстыльных фабрыках з 10 305 рабочых членамі прафсаюзаў лічылі сябе 9978 чалавек, або 97 % [3, арк. 3–10].

Нягледзячы на цэлы шэраг пралікаў, савецкая сістэма гаспадарання станоўча паўплывала на развіццё прамысловасці заходніх абласцей БССР. Так, напрыканцы 1940 г. тут дзейнічалі 392 прамысловых прадпрыемствы, на якіх працавала больш за 40 тыс. рабочых. Аб'ём жа валавай прадукцыі мясцовай прамысловасці павялічыўся амаль у 2 разы ў параўнанні з 1938 г. [5, с. 169] і склаў каля 27,6 % прамысловай вытворчасці рэспублікі [9, с. 32;]. У цэлым за 1940 г. заходнебеларускія фабрыкі і заводы выбрабілі каля 43 % драўніны рэспублікі, 49 % піламатэрыялаў, 54 % цэменту, 40 % шкіпідару, 98 % шарсцяной тканіны, 54 % цвёрдага скуранога тавару і інш. [7, с. 261]. Вялікую ролю ў пазітыўных зрухах такога кшталту адыгралі таксама і фінансавыя ўкладанні, якія савецкі ўрад асігнаваў на падтрымку і аднаўленне прамысловага патэнцыялу далучаных тэрыторый. Савецкія органы кіравання праводзілі рэформы накіраваныя на стварэнне эканамічнай магутнасці рэгіёну.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Докладные записки ЦК ЛКСМБ и др. о работе комсомола БССР, преобразованиях в социальной сфере, промышленности, сельском хозяйстве, культуре Западной Белоруссии, необходимости перспективного планирования в колхозах: 26 октября 1939 г. – 12 октября 1940 г. // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 14634. Арк. 1–115.

2. Документы о подготовке к выборам депутатов в Народное собрание Западной Белоруссии (проекты деклараций, тезисы доклада, списки и др.): октябрь 1939 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 13975. Арк. 1–124.

3. Документы о состоянии партийной, агитационно-массовой работы, развитии промышленности, сельского хозяйства, торговли, транспорта, народного образования, здравоохранения в западных областях БССР (постановления, выписки из протоколов,

докладные записки, справки и др.): 3 января – 17 апреля 1940 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 17000. Арк. 1–364.

4. Проекты постановлений ЦК КП(б)Б, выписки из протоколов заседаний бюро ЦК КП(б)Б, докладные записки и справки СНК, Госплана и наркоматов БССР о национализации и организации работы лесной, текстильной, полиграфической промышленности, систем промысловой кооперации, государственной торговли, создании профсоюзных и комсомольских организаций в Западной Белоруссии и др. вопросам: 1 октября – 15 декабря 1939 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 14031. Арк. 1–143.

5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці. Вучэбны дапаможнік. / І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін і інш. / Пад агульнай рэдакцыяй І. А. Марзалюка. Мінск: Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», 2022. 447 с.

6. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Экаперспектыва, 2006. 613 с.

7. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 2 / М. Касцюк, І. Ігнаценка, У. Вышынскі [і інш.]; Інстытут гісторыі АНБ. Мінск: Беларусь, 1995. 560 с.

8. Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук.тэарэт. канф., 17–18 верас. 1999 г., Мінск / адк. рэд.: П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў. Мінск: БДУ, 2000. 333 с.

9. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн. Кн. 2 / Нац. акад. наук Беларуси, Инт истории / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. Минск: Беларуская навука, 2014. 335 с.

10. «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…». Верасень 1939 г. – 1956 г.: дакументы і матэрыялы. У 2 кн. Кн. 1. Верасень 1939 г. – 1941 г. / склад.: У. І. Адамушка [і інш.]. Мінск: Беларуская навука, 2009. 340 с.